Выданне «Беларуса» з'яўлялася спробай паяднання хрысціянска-дэмакратычнай ідэалогіі з беларускім нацыянальным рухам і этнамоўным варыянтам беларускай нацыянальнай ідэі. У сацыяльна-палітычным плане пачалося стварэнне падмуркаў беларускай кансерватыўнай думкі, што было рэакцыяй на пашырэнне сацыялістычнай ідэі, асабліва сярод моладзі. Аднак пазнейшыя палітычныя і ваенныя падзеі перапынілі гэтую дзейнасць.

У **заключэнне** трэба адзначыць, што ў беларускім нацыянальна-культурным Адраджэнні пачатку XX ст. праявілася заканамернасць, характэрная для большасці нацый Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Дамінуючым варыянтам нацыянальнай ідэалогіі стаўся этнамоўны варыянт, які паслядоўна прапагандавала і адстойвала «Наша Ніва». Аднак звяртае на сябе ўвагу імкненне беларусаў парушыць ягоныя межы. Ва ўмовах моцных уплываў з боку польскай і расійскай культур беларускія палітыкі дзеля сацыяльнай і нацыянальна-культурнай мабілізацыі насельніцтва актыўна выкарыстоўвалі магчымасці дзяржаўніцкага (грамадзянскага) варыянта нацыянальнай ідэалогіі (маецца на ўвазе дэмакратычная і кансерватыўна-ліберальная плыні краёвасці), шукалі магчымасці паяднання беларускай ідэі з сацыялістычнай, хрысціянска-дэмакратычнай і кансерватыўнай ідэалагічнымі канцэпцыямі. Аднак гэтыя спробы аказаліся малаэфектыўнымі. Адсутнічала дзяржава, якая магла б з'яднаць усе этнасы краю ў беларускую нацыю дзяржаўнага тыпу. Большасць каталіцкага і праваслаўнага духавенства аказалася ўцягнутай у расійска-польскае змаганне за г.зв. «Паўночна-Заходні край» або «ўсходнія крэсы», а пралетарыят і буржуазія, свядомыя ўласнай беларускасці, не існавалі як палітычная сіла. У тагачасных ўмовах этнамоўны варыянт нацыянальнай ідэалогіі беларускага руху не меў альтэрнатывы.

*МІКАЛАЙ ЗАБАЎСКІ (Мінск)*

## РОЛЯ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА» ВА ЎЗБАГАЧЭННІ СЛАВЯНСКІХ КУЛЬТУР

У 1903 г. у Вільні была створана Беларуская сацыялістычная Грамада (БСГ), акая сваю бліжэйшую задачу бачыла ў звяржэнні самадзяржаўя разам з «пралетарыятам усіх народаў Расійскай дзяржавы» і ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі незалежнай дэмакратычнай рэспублікі на аснове раўнапраўя ўсіх грамадзян і поўнай улады народа. Да ліку заснавальнікаў БСГ адносіліся студэнты пецярбургскіх навучальных устаноў браты І. і А. Луцкевічы,

В. Іваноўскі, А. Пашкевіч (Цётка), А. Бурбіс (служачы), К. Кастравіцкі (Кастусь Каганец) і інш.

У пачатку XX ст. БСГ была адзінай нацыянальнай палітычнай партыяй, якая выступала ў абарону нацыянальных правоў беларусаў. Менавіта гэтым беларускі нацыянальны рух адрозніваўся ад нацыянальных рухаў суседзяў (палякаў, украінцаў і інш.), дзе актыўна дзейнічалі шматлікія нацыянальныя партыі.

З 10 лістапада 1906 г. кіраўнікі БСГ пачалі выдаваць у Вільні газету «Наша ніва», якая паставіла перад сабою мэту «служыць усяму скрыўджанаму беларускаму народу». Паляпшэнне сацыяльна-эканамічнага становішча народа газета звязвала з Дзяржаўнай думай. На старонках выдання друкавалася праграма паляпшэння становішча малазямельных і беззямельных сялян як наказ для думскіх дэпутатаў ад Беларусі, якія павінны былі ў Расійскім «парламенце» дамагацца вырашэння праблем беларускай вёскі: дазволу набываць і прадаваць сялянам землі, ліквідацыі цераспалосіцы, увядзення мясцовага самакіравання і інш. Для паляпшэння становішча сялянскіх гаспадарак «Наша ніва» прапагандавала ідэі хутарызацыі вёскі, стварэння таварыстваў і суполак, школ і бібліятэк.

І ўсё ж галоўную сваю задачу газета бачыла ў барацьбе за ўсебаковае нацыянальна-культурнае Адраджэнне беларускага народа, за прызнанне самога факта яго існавання, за яго роўнасць з іншымі народамі. З нумара ў нумар «нашаніўскія» кіраўнікі ўдзялялі шмат увагі абгрунтаванню правоў беларускага народа на захаванне і развіццё саёй мовы і культуры. Пратэстуючы супраць урадавай нацыянальнай палітыкі ў адносінах да беларусаў і ўкраінцаў (праваслаўныя беларусы і ўкраінцы далучаліся да вялікарускай народнасці) «Наша ніва» тлумачыла, што «кропля на кроплі складалася гісторыя беларусаў, з кожным векам умацоўвалася іх нацыянальная асобнасць ад родных братоў, і вось калі беларус адчуў сябе чалавекам, беларуская нацыяльная душа мусіла вызваліцца з векавых путаў». Афіцыяльнай палітыцы расколу беларускага народа па веравызнанні на «рускіх» і «палякаў», асімілятарскай дзейнасці праўрадавых нацыяналістычных груповак газета супрацьпастаўляла прапаганду нацыянальнай свядомасці і ідэі адзінства ўсіх беларусаў. Вакол газеты «Наша ніва» фарміравалася і яднвалася прагрэсіўная і адукаваная грамадскасць. Станоўчыя матэрыялы аб дзейнасці газеты, яе барацьбе за развіццё беларускай нацыянальнай культуры, аб творчасці нашаніўскіх пісьменнікаў сістэматычна друкаваліся ў шэрагу ўкраінскіх (кіеўскіх і львоўскіх), літоўскіх, чэшскіх, асобных расійскіх і польскіх выданнях. Асабліва плённым было супрацоўніцтва беларускіх і ўкраінскіх адраджэнцаў. У 1908 г. у Львове выйшла брашура І. Свянціцкага «Адраджэнне беларускага пісьменства». У № 4 за 1909 г. (22 студзеня) «Наша ніва» перадрукавала працу львоўскага прафесара ў перакладзе на беларускую мову. У гэтым жа годзе кіеўская газета «Рада» у нумарах 246, 247, 249 змясціла вялікі артыкул вядомага публіцыста і грамадскага дзеяча

Д.Дарашэнкі «Беларусы і іх нацыянальнае адраджэнне». Гэты артыкул таксама быў перадрукаваны «Нашай нівай». У 1914 г. гісторык І. Крыпякевіч выдаў у Львове брашуру «Беларусы», у якой змясціў некалькі перакладаў твораў Я. Купалы.

«Наша ніва», прыкладаючы намаганні для развіцця беларускай літаратурнай мовы, у многім арыентавалася на ўкраінскі вопыт. У сваіх дванаццаці «Лістах з Украіны» Янка Журба і Сяргей Палуян, якія жылі ва Украіне, знаёмілі чытычоў «Нашай нівы» з яе культурным жыццём. Яны пісалі аб тым, што ўкраінскі народ таксама хоча больш ведаць аб стане беларускай культуры. У прыватнасці, малады С. Палуян адзначаў: «Асабліва цікавіць украінцаў моц беларускай паэзіі. У гутарках кажуць, што народ, які з самага пачатку свайго нацыянальнага жыцця мае такі ўзровень паэзіі, зможа перамагчы ўсе перашкоды на пуціне свайго развіцця, зможа дагнаць на гасцінцы поступу тыя народы, якія даўно ідуць наперадзе».

Газета «Наша ніва» даволі шырока адлюстроўвала нацыянальна-культурнае жыццё ўкраінскага народа. Газета анансавала розныя ўкраінскія выданні. У 1909 г. на цэлы газетны разварот быў змешчаны здымак усіх 18 украінскіх газет і часопісаў, якія з 1905 па 1909 гг. выдаваліся ва Левабярэжнай Украіне. Здымак суправаджаў подпіс: «Усе, для каго непрыемна адраджэнне прыгнечанага народа, косым вокам пазіралі на ўкраінскія нацыянальныя газеты. Але ўкраінцы так моцна трымаюцца за свой родны грунт, што нічым іх не напалохаеш. І вось яны падгрымліваюць на сваёй зямлі столькі розных часопісаў, і грошы на гэтыя часопісы дае сам народ, выпісваючы ва ўсе куткі вялікай Украіны газеты на роднай мове».

«Наша ніва» даволі часта змяшчала пераклады ўкраінскіх мастацкіх твораў: пасланне «Мёртвым і жывым» Т. Шаўчэнкі (пераклад А. Гурло. 1911. № 8); верш «Цячэ вада ў сіне мора» (пераклад Ф. Чарнышэвіча, ён жа пераклаў паэму «Кацярына», якая выйшла асобным выданнем); апавяданне М. Чарняўскага «Першы снег» (пераклад Я. Окліч); апавяданні Гваздыні «Злодзей»; Грабінкі «Кручаная авечка» (пераклаў У. Галубок); вершы С. Руданскага (А. Паўловіч). Без указання прозвішчаў аўтараў у «Нашай ніве» друкаваліся пераклады з украінскай мовы апавядання «Матчына сэрца» (пераклаў Швайко) і верша «Тры кветкі» у перакладзе Цёткі. У перакладзе Р. Зямкевіча на працягу 1909–1911 гг. у газеце былі змешчаны 10 навел В. Стэфаніка («Смерць», «Змярканне», «Сіняя кніжачка», «Выводзілі з сяла», «Сама самюсенька», «Ліст», «Кацярына», «Анёл», «Дарога», «Сон»).

Аднымі з першых пастановак беларускіх драматычных гуртоў у пачатку XX ст., а пасля і прафесійнай трупы І. Буйніцкага былі пераклады п'есаў украінскіх аўтараў «Па рэвізіі», «Пашыліся ў дурні» Крапіўніцкага, «Разумны і дурань» Карпенкі-Карага і інш. Я. Колас прысутнічаў на спектаклі па п'есе Крапіўніцкага і на старонках «Нашай нівы» напісаў водгук: «Спектакль «Пашыліся ў дурні» прайшоў весела, бойка, жыва і цікава. Усе артысты споўнілі

сваеролі, як праўдзівыя прыродныя артысты... Тэатр страшэнна зацікавіў мяне, і ў ім я пачуў вялікую сілу падняцця народнага духу і яго гонару, і нішто, як ён не можа зрабіць столькі для адраджэння Беларусі» (1912. № 7).

Асабліва часта на старонках газеты «Наша ніва» з'яўлялася імя Т. Шаўчэнкі. Да 95-годдзя з дня яго нараджэння былі змешчаны здымак і бібліяграфічныя звесткі, верш Я. Купалы «Памяці Шаўчэнкі». Тут жа паведамлялася пра вечар «Бацькі Тараса» ў Пецярбургу, на якім прысутнічалі і выступалі беларусы. Да 50-годдзя з дня смерці Кабзара «Наша ніва» надрукавала два вялікія артыкулы – «Памяці Тараса Шаўчэнкі» А. Бульбы і «Тарас Шаўчэнка і беларусы» Р. Зямкевіча. У нумары № 6 за 1911 г. газета пісала пра забарону ўшанавання памяці Шаўчэнкі ў Кіеве.

Літаральна з першага нумара «Наша ніва» выкрывала сутнасць дзейнасці ў Беларусі польскіх нацыяналістаў, якія «сеялі сварку і нянавісць» паміж католікамі і праваслаўнымі беларусамі. «І ў выніку, – канстатавала газета «Наша ніва», – няма адзінства сярод беларускіх сялян: адны пайшлі за «истинно-русских», другія – за «истинно-польских» людзей. А розніца паміж імі тая, што адны цягнуць у бок Масквы, другія – у бок Варшавы, а ўсе разам імкнуцца захапіць у свае рукі цёмны народ наш ды спакойна абдзіраць яго» (1907, 23 красавіка).

У палеміцы з рускімі і польскімі нацыяналістамі «Наша ніва» не атаясамлівала іх з рускім і польскім народамі. Шматлікія аўтары, рэдакцыя газеты тлумачылі, што рускія і польскія народы маюць вялікую навуку і культуру, заклікалі беларусаў вывучаць іх, але не забываць у той жа час родную мову і культуру. Сваіх чытачоў газета знаёміла з перакладамі твораў Л. Талстога, М. Чорнага, В. Караленкі, І. Тургенева, А. Чэхава. Рэдакцыя газеты разумела неабходнасць паскоранага развіцця нацыянальнай літаратуры на аснове творчага засваення лепшых дасягненняў рускай літаратуры. Беларускае адраджэнне станоўча ацэньвалася ў артыкулах прафесара А. Пагодзіна, у часопісах «Московский еженедневник» (1909) і ліберальным « Вестнике Европы» (1911). Цікавіліся беларускім адраджэннем і прафесары Пецярбургскага універсітэта (у тым ліку акадэмік А. Шахматаў), якія ажыццяўлялі навуковае кіраўніцтва дзейнасцю студэнцкага гуртка па даследаванні пытанняў беларусазнаўства.

Цэнтральны орган беларускага адраджэнскага руху пільна сачыў за выступленнямі ў Думе дэпутатаў ад Беларусі, рэгулярна змяшчаў на сваіх старонках вытрымкі з прамоў трудавікоў, кадэтаў, сацыял-дэмакратаў, абраных ад іншых рэгіёнаў Расіі. «Але аб нашым краі, – пісала «Наша ніва», – не ўпамянуў ні адзін дэпутат. Ніхто не сказаў аб тым, як цяжка жывецца народу ў Беларусі, што неабходна для нашага краю». Газета абуралася паводзінамі мінскіх сялянскіх дэпутатаў В. Мельніка і П. Грудзінскага, якія яшчэ далей пайшлі за правымі, і бяздзейнасцю гродзенскіх дэпутатаў. «Наша ніва» паведамляла, што дэпутаты ад Украіны аб'ядналіся ва «ўкраінскую трудавую грамаду»,

выдаюць газету і падтрымліваюць цесныя сувязі са сваімі выбаршчыкамі. «А нашы? – тлумачыла газета, – не маюць нічога агульнага з тымі людзьмі, хто паслаў іх у Думу пастаяць за наш край». І з жалем заключыла: «Праўду, відаць, кажуць, што народ беларускі найцямнейшы ды найбольш прыбіты: такіх ён і дэпутатаў выбраў» (1907, 18 мая).

Такім чынам, нацыянальна-культурнае Адраджэнне беларускага народа і развіццё яго культуры ў пачатку XX ст. значна ўзбагачала славянскую культуру.

*ЯРАСЛАЎ ЛІС (Мінск)*

## ПУБЛІЦЫСТЫКА БРАНІСЛАВА ТАРАШКЕВІЧА Ў СУВЯЗІ З ПОЛІЭТНІЧНАЙ І ПОЛІКАНФЕСІЙНАЙ ГРАМАДСКАЙ ДУМКАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 20-Х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ

У гісторыі багатай і разнастайнай беларускай грамадскай думкі 20-х гг. мінулага стагоддзя адметнае месца належыць публіцыстыцы вучонага і палітычнага дзеяча Браніслава Адамавіча Тарашкевіча (1892-1938). Цікавая сама па сабе як зместам, так і формай, нярэдка па-сапраўднаму мастацкая, яна мае вялікае значэнне для вывучэння гісторыі беларускага нацыянальнага руху, бо ўзнікла як арганічны выраз ягоных патрэб і задач.

Першыя публічныя палітычныя выступленні Б. Тарашкевіча адносяцца да самага пачатку 20-х гг., калі ўпершыню выявілася імкненне польскіх палітычных колаў да ўключэння (інкарпарацыі) Беларусі ў склад адроджанай Польшчы. Гэтая ідэя была часткова рэалізавана ў сакавіку 1921 г. у Рызе на польска-савецкіх перамовах. Летам 1920 г. Б. Тарашкевіч выступіў з публікацыяй «Беларускія палітычныя пастулаты» ў газеце польскіх інтэлектуалаў «Przymierze». Ён адназначна засведчыў, што бачыць будучыню беларускага народа толькі на трывалых асновах дзяржаўнай незалежнасці. Прааналізаваўшы рашэнні Усебеларускага з'езду ў снежні 1917 г. і змест трох Устаўных грамат Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (люты – сакавік 1918 г.), Тарашкевіч ахарактарызаваў пазіцыі беларускіх палітычных сіл. Адным з галоўных пастулатаў быў наступны: «Ад польскага ўрада і асабліва грамадства патрабуем, каб аграрную рэформу лічылі за ўнутраную справу Беларусі; павінен быць аб'яўлены поўны «дэзінтэрэсман» у справах маёмаснага стану грамадзян палякаў, уласнасць якіх павінна падпарадкоўвацца тым самым правам, што і ўласнасць усіх іншых грамадзян Беларусі. Акрамя таго, ад польскай